*Літаратура ў кантэксце жыцця*

Любоў БАРАНОЎСКАЯ

# СЭНСАВАЯ АБ'ЁМНАСЦЬ ПАЭМЫ "ОДЗІУМ" ЯНКІ СІПАКОВА

Тэма ўзаемаадносінаў чалавека і прыроды стала найбольш актуальнай у 80-я гг. XX ст., калі беларуская зямля зведала страшную трагедыю – пятая частка краіны была забруджана радыяцыяй. На сёння зафіксавана шмат фактаў, якія сведчаць пра вялікія людскія страты. Вынік чарнобыльскай аварыі – катастрафічны стан, у якім апынулася прыроднае асяроддзе. Зразумела, што беларускія пісьменнікі не маглі абысці ўвагай экалагічную праблему.

Адна з мастацкіх формаў рэагавання на чарнобыльскую трагедыю – малітва. Здаецца, у такой цяжкай безвыходнай сітуацыі чалавеку застаецца адно – маліцца, спадзявацца на цуд, які можа вывесці з лабірынтаў трагічнага становішча. Невыпадкова беларускія пісьменнікі напісалі творы пра бяду, выкарыстоўваючы элементы малітвы, у тым ліку "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько, "Галгофа" К. Жука, "Вячэрняя малітва" А. Пісьмянкова і інш. З гэтага шэрагу і паэма Янкі Сіпакова "Одзіум". Тут мы сустракаем алюзію на адну з самых галоўных хрысціянскіх малітваў "Ойча наш". Як сола гучыць яна на фоне харавога выканання, гарманічнага шматгалосся, якое складаюць разважанні аўтара, апісанні фактаў.

Пэўныя паралелі можна правесці паміж структурай паэмы і асноўнымі часткамі кананічнай малітвы. Умоўна "Одзіум", як і "Ойча наш", можна падзяліць на тры часткі: 1) заклік ("Ойча наш, калі ты ёсць на нябёсах!"); 2) сем просьбаў; 3) славаслоўе ("Калі ёсць царства, сіла і воля Твая з веку ў век. Амінь"). У першай частцы аўтар апісвае сітуацыю, якая склалася на Беларусі пасля чарнобыльскай катастрофы. Гэта выпрабаванне веры – гаворка ідзе пра бязмежнае цярпенне беларускага народа. У звароце да Бога аўтар просіць не за сябе, а за сваю Бацькаўшчыну:

*Усё мае сваю мяжу, і толькі цярпенне наша,*
*о Божа, бязмежнае!*[1]

Забруджанымі зрабіліся зямля, паветра *"Божа наш літасцівы, вярні ранейшае значэнне гэтым спрадвечным паняццям!"* (358) – гучыць першая просьба паэта. Наступная – "Хлеб наш надзённы дай нам днесь...". Словам з малітвы супрацьстаяць трагічныя па сваім гучанні радкі: *"А мы сеем на мёртвых землях мёртвым насеннем"* (364). Дараваць даўгі – трэцяя просьба малітвы "Ойча наш". Прычым у ёй гаворыцца, што наколькі мы можам дараваць іншым, настолькі Бог можа дараваць нам. Дабро нараджае дабро, а зло – заўсёды зло. Аўтар сцвярджае, што Чарнобыль – вынік людской бяздумнасці і абыякавасці:

*Дзякуй табе, родны мой народ, за дабрыню,*
*за міласэрнасць і спачуванне дзякуй!*
*За высакароднасць дзякуй.*
*Дзякуй за спагаду да чужой бяды.*
*Але нехта мог бы і падказаць табе: "Памажы*
*і сваім нівам і птушкам, рэкам і дрэвам,*
*хатам і людзям".*
*Дзецям сваім памажы!!!* (366).

Хто вінаваты ў трагедыі? Каму дараваць? І ці можна такое дараваць? На гэтыя пытанні адказу ў аўтара няма.

"І не ўводзь нас, Божа, у спакусу". Ад хлеба, малака, яблыка, асвечанага Чарнобылем, трэба ўстрымацца, каб не спакусіцца:

*Яны даюць, а хочацца адабраць.*
*Яны ўгаворваюць есці, а хочацца закрычаць:*
*"Не еш!"*
*Даюць ежу, а разумеюць, што даюць атруту* (369).

Паводле хрысціянскіх канонаў, спакусіцца – значыць упасці ў грэх. І калі мы звернемся да этымалогіі слова "грэх", то заўважым, што на беларускую мову яно перакладаецца як "промах, міма мэты". Менавіта Чарнобыль стаў тым вялікім промахам, які дапусціла чалавецтва, бо наступствы пасля яго катастрафічныя (гаворка ідзе пра Апакаліпсіс).

У сваёй апошняй просьбе – "І ўратуй нас ад нячысціка" – аўтар кажа пра тое, што радыяцыйны бруд распаўсюджваецца па ўсёй краіне:

*Разумны чалавек заўсёды ратуе свой народ,*
*а дурны яго забівае.*
*Калі ёсць хоць адзін хібакусі, трэба,*
*каб у Беларусі былі ўсе хібакусі.*
*І мы робім усё, каб так яно не было.*
*Памагаем растопваць па усёй рэспубліцы*
*радыяцыю* (372 – 373).

У трэцяй частцы прыгадваецца Троіца, *"але не святая, а клятая"*:

*Нахабна спраўляюць свой жуд, раскашуюцца*
*на тутэйшай зямлі два браты і сястра*
*з нетутэйшымі імёнамі – Катаклізм,*
*Апакаліпсіс і Катастрофа – а за імі аж*
*скуголіць ад задавальнення іхняя мутнавокая*
*спадкаемка з быццам бы тутэйшым*
*імем – Бяда...* (375).

У нашы дні цывілізацыя знаходзіцца паміж двума полюсамі. З аднаго боку, востра стаіць праблема эканамічнага развіцця, а з другога – пагражае татальная гібель усяго жывога ў выніку разбурэння нава-

*У чэрвеньскім нумары нашага часопіса змешчаны артыкул* ***Любові Бараноўскай*** *"З любоўю і спагадай: Ідэйна-мастацкая трактоўка вобразаў фаўны ў паэзіі Янкі Сіпакова".*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

кольнага асяроддзя. Гаворка ідзе пра экалагічную катастрофу. Чарнобыльская бяда, як у фокусе, засведчыла трагічнасць становішча. Менавіта гэта і адлюстраваў у паэме Я. Сіпакоў.

Выкарыстанне шматлікіх сімвалаў, метафар і іншых мастацкіх сродкаў скіравана ў "Одзіуме" на драматычна-трагедыйнае раскрыццё чарнобыльскай тэмы. Анімалістычныя вобразы дапамагаюць убачыць і адчуць увесь катастрафізм жыцця чалавека і яго побыту. І цялятка, і кароўку Святоху аўтар называе рэактарам, бо ўсё, што забруджана радыяцыяй, зрабілася небяспекай для чалавека:

*Карова – рэактар, сцежка – рэактар,*
*і нават кучка памёту ад бабкіпараскінага*
*цялятка – зноў жа небяспечны рэактар.*
*І чалавек апраменены – рэактар* (362).

Слова "рэактар" гучыць як прысуд, які ставіць крыж на існаванні ўсяго жывога. Меншыя браты чалавека ператварыліся ў тых, што ўяўляюць небяспеку для яго ж самога. Пад уплывам Чарнобыля адбылося пераасэнсаванне традыцыйных вобразаў фауны. Так, вобраз **пчалы** ў народных павер'ях усходніх славянаў выступае сімвалам урадлівасці, плоднасці, памнажэння роду. Разам з тым пчала выступала зброяй бога Ярылы, які абуджае зямлю. У сіпакоўскім творы пчала – гэта бомба:

*Была пчала – пацешная такая, выпацканая*
*ўся ў жоўты дзьмухаўцовы пылок,*
*а стала маленька-вялікаю атамнаю бомбаю* (358).

Матыў пчалы прысутнічае і ў шэрагу іншых твораў беларускіх пісьменнікаў, прысвечаных адлюстраванню чарнобыльскай явы (згадаем апавяданне "Сенакос у канцы красавіка" В. Казько і інш.).

Здаўна жыццё чалавека знаходзіцца ў поўнай залежнасці ад свойскіх жывёлаў. Так, **карова** была асновай уласнай гаспадаркі. Нацыянальная кухня ўключае вялікую колькасць стравaў з выкарыстаннем малака. Сырадой – напой, які беларусы пілі і ў будні, і ў святы, – Чарнобыль зрабіў атрутай:

*Белае малако – чорнае. І бруднае: яно*
*забруджана невідочнымі радыенуклідамі* (367).

Са старажытных часоў карова лічылася свяшчэннай. Вобраз каровы ёсць у міфалогіях народаў усходу, фінаў, нарвежцаў, немцаў. З гэтым вобразам звязваліся такія з'явы, як паходжанне свету, складанне календара (прыгадаем год Быка ва ўсходнім календары). У беларусаў цельная карова лічылася сведчаннем дабрабыту. Старажытныя славяне верылі, што апрацоўваць зямлю іх навучылі багі, якія аралі на быках. Я. Сіпакоў выкарыстоўвае гэты анімалістычны вобраз, каб больш ярка апісаць сітуацыю, якая склалася на забруджанай Чарнобылем беларускай зямлі. У творы паказаны крах гаспадаркі, без якой немагчыма ўявіць нармальнае жыццё беларуса-працаўніка. Праз анімалістычныя вобразы аўтар паказвае трагізм існавання жывых істотаў. Так, карова, якая сведчыла пра дабрабыт у хаце, сямейны лад, спакойнае і размеранае жыццё чалавека, у паэме паўстае як сімвал краху, заняпаду гаспадаркі, жыцця людзей, бо яе малако, мяса – атрута:

*Ціхамірна пасуцца каровы, скубуць сабе*
*траву, а разам з ёю і мірны наш атам* (370).

Гаспадарка пасля Чарнобыля шмат дзе прыйшла ў заняпад. Разам з тым абвастрылася і праблема экалагічнага выжывання. Пад пагрозай існавання апынуўся не толькі чалавек, але і прадстаўнікі фаўны. Гэта і бусел з аповесці "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" В. Казько, і сабака з апавядання "Львы" І. Пташнікава, і воўк з паэмы "Чорная быль" С. Законнікава і інш. *"Чалавеку радыяцыя недаспадобы, а прыродзе яна, здаецца, спадабалася"* (371), – не без горкай іроніі кажа Я. Сіпакоў у паэме "Одзіум". Аўтар апісвае становішча, у якім апынуліся жывёлы падчас катастрофы. Іх мышцы і косці, кожная клетка, кожная кропля крыві насычана той самай падступнай, нябачнай і непрыкметнай атрутай, дзеянне якой у поўнай меры будзе адчувацца праз дзесяткі і сотні гадоў, праз мноства пакаленняў:

*Ці можа мінулае забіваць будучыню?*
*Вось, к прыкладу, клетка – надзейная схова*
*для будучыні* (371).

Тут гаворка ідзе пра мутацыю, якая правакуе гігантызм і розныя анамаліі ў жывёлаў:

*Лятаюць вялізныя, як вароны, камары,*
*а вароны – быццам цяляты.*
*Жабы і то што тыя львы – такія вялізныя.*
*То няма зусім ног, то іх не хапае, то яны*
*лішнія.* <...>
*То няма зусім вачэй, то іх – не злічыць.*
*З адных толькі вачэй сабрана галава*
*ў цялятка* (371).

Іншыя прадстаўнікі фаўны ў паэме Я. Сіпакова "Одзіум" – жывёлы-мутанты – таксама ахвяры чалавечай бяздумнасці, бездухоўнасці, абыякавасці.

Паэт апавядае пра мутацыі сярод людзей. Вядома, што развіццё чалавека і развіццё жывёлаў адбываецца па адной схеме. Ім разам прыйдзецца прайсці праз Чарнобыль. І невядома, чым яшчэ адгукнецца ён. Але зразумела, што Чарнобыль застанецца ў людзей прадметам нянавісці і нараканняў – одзіумам, як казалі старажытныя рымляне. Невыпадкова, што паэма пра чарнобыльскую трагедыю мае такую назву.

Такім чынам, у паэме "Одзіум" выяўляецца трагедыйная канцэпцыя існавання жывога свету пасля Чарнобыля. Вобразы фаўны паўстаюць перад намі як сімвалы бяды, небяспекі, смерці; яны дапамагаюць паэту глыбей раскрыць разбурэнне адвечнага народнага побыту, катастрафізм нацыянальнага быцця. Мастацкі анімалізм Я. Сіпакова мае экалагічную і гуманістычную скіраванасць. Чарнобыль пакінуў глыбокі след у чалавечай душы і свядомасці, сёння нярэдка кажуць пра духоўны Чарнобыль, маючы на ўвазе разбураныя культурныя і духоўныя каштоўнасці.

---

[1] **Сіпакоў Я.** Выбраныя творы: У 2 т. Т. 1. – Мінск, 1995. С. 358. Далей цытаты падаюцца па гэтым выданні з пазначэннем тома і старонкі ў дужках.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова